# Проблемы содержания педагогического образования

**Л.М.Ціханаў, А.А.Грымаць,**
**БДПУ**

## НА ШЛЯХАХ ДА СТВАРЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ ПАДРЫХТОЎКІ ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ

Для сістэмы педагагічнай адукацыі характэрна дыскрэтная арганізацыйная аснова, дзякуючы чаму ў яе дынаміку ўключаюцца розныя ступені і формы павышэння агульнаадукацыйнага і прафесійнага ўзроўню педагогаў. Існуе шмат падыходаў у вызначэнні гэтага фенамену. Напрыклад, Г.П.Зінчанка лічыць бесперапынную адукацыю не асобным відам, і не своеасаблівай надбудовай (з гэтай думкай даводзіцца даволі часта сустракацца), а зусім новым спосабам адукацыйнай дзейнасці, які садзейнічае вырашэнню супярэчнасцей паміж патрабаваннямі навуковага прагрэсу і тым, што можа даць і дае сучасная сістэма падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Мы пагаджаемся з тымі крытычнымі думкамі, якія выказваюць прадстаўнікі творчага калектыву "Нацыянальная школа Беларусі" пад кіраўніцтвам А.У.Казуляна, што, абапіраючыся на ідэі бесперапыннай адукацыі ў падрыхтоўцы педагогаў, нельга практыкаваць як своеасаблівую педагагічную павіннасць ад нараджэння і да скону. Дыскрэтнасць працэсу станаўлення прафесіяналізму нараджае складанасці арганізацыі дынамічнай сістэмы, забеспячэння пераемнасці яе звенняў, прагназіравання вынікаў і шляхоў развіцця. Пераадоленне гэтых цяжкасцей магчыма на шляхах шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў, калі пры пераходзе з адной ступені адукацыі на другую змяняюцца:

- сацыяльны статус навучэнцаў;
- задачы, устаноўкі, патрабаванні да навучэнцаў;
- змест, вучэбныя планы, формы і метады адукацыі;
- прафесійная кваліфікацыя выкладчыкаў;
- умовы і ступень самастойнасці навучэнцаў;
- якасці асобы, якія неабходны для паспяховага выканання новых сацыяльных роляў.

Пераход нашай дзяржавы ад таталітарнай мадэлі кіравання грамадствам да дэмакратычнай, ад гранічна цэнтралізаванага вядзення гаспадаркі да рыначнай эканомікі ставіць перад сферай адукацыі задачу выхавання свабоднага ў выбары чалавека, культурнага суб'екта ўласнай дзейнасці, свядома і адказна прымаючага рашэнні. Установы ж педадукацыі арыентаваны на падрыхтоўку педагога-выканаўца, без уліку індывідуальных здольнасцяў і інтарэсаў навучаемых студэнтаў. Адукацыйны прагрэс будучых педагогаў часцей за ўсё строга дэтэрмінаваны.

Дэідэлагізацыя і гуманізацыя выхавальна-адукацыйнага працэсу, змена мэтавых арыентацый і абнаўленне праграм агульнай сярэдняй адукацыі, правы, атрыманыя педагогамі на свабодную самадзейнасць у іх педагагічнай творчасці - гэтыя ключавыя накірункі стабілізацыі і развіцця ў рэспубліцы патрабуюць педагога новага тыпу.

Існуючая сёння сістэма педагагічнай адукацыі арыентавана і прыстасавана да падрыхтоўкі рэтранслятара ведаў, уменняў і навыкаў, практычна не забяспечанага сродкамі, запускаючымі самаразвіццё навучэнца. У структуры і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

змесце падрыхтоўкі настаўнікаў замацаваўся і атрымаў сілу традыцыйны прадметна-метадычны падыход да навучання.

Такім чынам, існуючая сістэма педагагічнай адукацыі не адпавядае ні патрабаванням сацыяльна культурнай сітуацыі, ні патрабаванням развіваючай школы.

Існуючая канцэпцыя педагагічнай адукацыі характарызуецца празмернай дэкларатыўнасцю. Як вынік дэкларатыўнасці і апісальнасці іх немагчыма выкарыстаць за аснову пры праектаванні вучэбнага працэсу ў канкрэтнай установе педагагічнай адукацыі.

Прапануемыя канцэптуальныя палажэнні абапіраюцца на культурна-гістарычны і дзейнасны падыход да чалавека і працэсаў яго анта- і філагенезу (Л.С.Выгоцкі, А.М.Лявонцьеў, Д.Б.Эльконін, Э.В.Ільянкоў, В.В.Давыдаў, Г.П.Шчадравіцкі і інш.) і звязаны з арыентацыяй на парадыгму "Ведай, што развіваецца ў тваім вучні, і ўмей гэта забяспечыць". Вывучэнне прадметаў пры гэтай парадыгме становіцца не самамэтай, а толькі сродкамі развіцця студэнтаў. Пры яе прытрымліванні вядучай супярэчнасцю адукацыйнага працэсу ва ўмовах педадукацыі становіцца супярэчнасць паміж авалоданнем вучэбнай дзейнасцю і фарміраваннем уласнай педагагічнай пазіцыі. Пазбаўленне гэтай супярэчнасці патрабуе пабудовы кожным студэнтам для самаго сябе індывідуальнай парадыгмы адукацыі. Пазіцыя студэнта ў час навучання ў гэтым падыходзе мяняецца ад пазіцыі "таго, каго вучаць" да "таго, хто вучыць". Пазіцыя выкладчыка таксама мяняецца ад "транслятара пэўных ведаў і тэхнік педагагічнай працы" праз пазіцыю "магістра" да пазіцыі "кансультанта". Гэта пазіцыя арганізуе рэфлексію і папаўняе дэфіцыт ведаў у студэнта, праектуючага і рэалізуючага ўласную педагагічную дзейнасць. Іншымі словамі, у працэсе педагагічнай адукацыі студэнт ператвараецца ў суб'екта педагагічнай дзейнасці. Менавіта гэтым мы кіраваліся, распрацоўваючы сістэму шматузроўневай падрыхтоўкі настаўнікаў.

Шматузроўневая сістэма педагагічнай адукацыі, якая ўводзіцца ў БДПУ, патрабуе адпаведнай праверкі ў ходзе даследчыцка-эксперыментальнай работы.

Для здзяйснення такой работы неабходна праграмма, якая ўключае:

- абгрунтаванне неабходнасці ва універсітэце ў асобных яго падраздзяленнях (факультэты, цэнтры, лабараторыі, кафедры і г.д.) вызначае працягласць эксперыменту;
- сутнасць новаўвядзенняў, іх кароткая характарыстыка;
- зыходныя палажэнні; асноўныя ідэі, на якіх абапіраюцца эксперыментатары;
- мэта эксперыменту і чакаемыя вынікі (змястоўныя па сутнасці, арганізацыйныя, метадычныя, асобасна-адукацыйныя, асобасна-прафесіянальныя і г.д.) ;
- гіпотэза;
- апісанне этапаў эксперыменту (падрыхтоўчы, пошукавы, пошукава-пераўтваральны, абагульняючы);
- задачы кожнага этапу;
- змест і формы эксперыментальнай работы;
- спосабы аналізу і ацэнкі вынікаў;
- удзельнікі эксперыменту (выкладчыкі, творчыя аб'яднанні, розныя групы выкладчыкаў і г.д.);
- умовы правядзення даследчыцка-эксперыментальнай работы (кадравая, навукова-метадычная, тэхнічная, матэрыяльна-фінансавае забяспячэнне).

У аснову эксперыменту ў БДПУ пакладзены ідэі, якія патрабуюць свайй далейшай канкрэтызацыі і карэкцыі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- апераджальнага характару развіцця вышэйшай (ВНУ) адукацыі, якое абумоўвае эфектыўнасць пераўтварэнняў ва ўсіх сферах жыцця грамадства;
- прыярытэтнай цэннасці адукацыі, забяспечваючай уваход і спосаб існавання Чалавека ў свеце сучаснай культуры, рэалізацыю патрэбнасцяў асобы "здзейсніць, здзейсніць сябе";
- гуманізацыі, дыферэнцыяцыі і інтэграцыі ведаў аб чалавеку як асновы гуманізацыі зместу педагагічнай адукацыі;
- пераемнасці інавацыйнай дзейнасці на ўсіх этапах бесперапыннай педагагічнай адукацыі;
- варыятыўнасць шляхоў дасягнення дзяржаўных адукацыйных стандартаў, дазваляючых захаваць самастойнасць склаўшыхся традыцый адукацыі і навуковых школ ВНУ;
- спалучанасці адукацыі і прафесіянальнай падрыхтоўкі;
- канвертуемасці адукацыйных дыпломаў і кваліфікацыйных сертыфікатаў;
- гібкасць структурнай арганізацыі адукацыйнага працэсу ў ВНУ, якая забяспечвае аператыўнае рэагаванне на дынаміку адукацыйных інтарэсаў асобы і сацыякультурных, эканамічных змяненняў у грамадстве;
- канцэптуальнага адзінства даследчыцка-эксперыментальнай работы ў спалучэнні з сінхронным, але рознатэмпавым рухам у эксперыменце розных структурных падраздзяленняў універсітэта.

**Е.И.Сермяжко,**
**МГПИ им. А.А.Кулешова**

## ЭТАПЫ РАЗРАБОТКИ СОДЕРЖАНИЯ ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ И КРИТЕРИИ ЕГО ОТБОРА

Современное состояние содержания педагогического образования в педвузах республики совершенно устарело и нуждается в радикальном изменении. Речь нужно вести именно о коренном изменении, а не совершенствовании содержания педагогического образования, ибо совершенствовать старые программы и учебные пособия по педагогике в силу их научной несостоятельности и практической бесполезности - дело бесперспективное.

Разработку нового содержания педагогического образования нужно начинать с составления проекта, включающего в себя : а) определение целей подготовки педкадров для различных типов учебно-воспитательных учреждений; б) определение критериев (принципов) отбора педагогических знаний и их отбор; в) выбор стратегии обучения специалистов в области обучения и воспитания. Лишь после этой работы можно приступить к подготовке учебных материалов (учебных программ и учебных пособий по различным педагогическим дисциплинам), распределение этих материалов по годам, циклам или уровням обучения.

На этом, втором этапе, необходимо апробировать новое содержание педагогического образования и, если нужно, доработать его.

На заключительном, третьем этапе, осуществляется распространение и внедрение новых учебных материалов и подготовка кадров для работы по новому содержанию педагогического образования.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ